Bielarus569C.qxd 6/13/2010 12:46 AM Page 3

Жыве Беларусь!

# БЕЛАРУС

Address: P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

BIELARUS/Belarusan newspaper in Free World ISSN 1054-9455
Published by the Belarusan American Association, Inc.

№ 569 Чэрвень 2010 г.
Год выданьня 60

## БЕЛАРУС

### Шаноўнае спадарства!

31-га траўня сёлета закончыўся тэрмін збору твораў для чарговага, ужо чацьвёртага па ліку, альманаху беларускіх пісьменьнікаў замежжа “БЕЛАРУС” за 2010 год. Наступны крок - гэта падрыхтоўка тэкстаў і друк самога выданьня. Маем надзею, што да канца жніўеня вы зможаце трымаць яго ў руках.

Нажаль, сёлета з-за высокіх выдаткаў друку і вельмі абмежаваных фінансавых магчымасьцяў рэдакцыі далёка ня ўсе падпісчыкі газэты “Беларус” змогуць атрымаць альманах у якасьці падарунка, як было летась. **Бескаштоўна** альманах будзе дасланы толькі тым асобам, што ахвяравалі на выдавецкі фонд газэты суму, большую за кошт гадавой падпіскі (г. зн. больш за **$50**).

Усе іншыя падпісчыкі маюць магчымасьць замовіць выданьне поштаю па зьніжанаму кошту, які сёлета складае **$12**.

Калі вы не выпісваеце газэту “Беларус”, то кошт альманаху для вас будзе **$15**. Замова аднаго асобніка альманаху для жыхароў Канады будзе каштаваць **$18**, усіх іншых краінаў сьвету **$20**.

Калі ласка, дасылайце свае замовы і аплату загадзя. Гэта дапаможа дакладней вызначыць наклад выданьня. Замовы дасылайце на адрас:

***BIELARUS***
***P. O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

Чэкі ці грашовыя пераводы выпісвайце на імя **BIELARUS**.

З пытаньнямі кантактуйце рэдакцыю.

## КУПАЛЬЛЕ

**Запрашаем разам адзначыць старадаўнюю рамантычную традыцыю КУПАЛЬЛЯ і правесьці незабыўны адпачынак у кампаніі суродзічаў на ўлоньні прыроды.** Купальскі вечар пачнецца з прызначэньня Князя-Купаліша і Купалінкі, якія распаляць вогнішча. Уночы нячысьцікі выкрадуць Купалінку. Каб даведацца пра іншыя падзеі і абрады купальскай ночы далучайцеся да нас. Пачастуйцеся крупнікам, у склад якога па традыцыі ўваходзяць 27 лекавых траваў. Можа каму з вас пашанцуе знайсьці сваю папараць-кветку ў гэтую чароўную ноч.

**Калі:** **18-20 чэрвеня 2010 году** (Купальская ноч у суботу 19 чэрвеня).

**Дзе:** Парк ***Ward Pound Ridge Reservation*** у ***Cross River, NY 10518***

**Транспарт:** цягніком са станцыі ***Grand Central*** да прыпынку ***Katonah***. Гэта прыкладна гадзіна язды цягніком ад Мангэтану на ***Metro North, Harlem Line***.

**Кошт:** **$25** дарослым, **$10** дзецям. Чэкі выпісвайце на ***Mr. & Mrs. Ryzy*** з адзнакаю “***Купальле***” і дасылайце на адрас:
***Piotr & Lena Ryzy***
***P. O. Box 1952***
***Ossining, NY 10562***

**Кантакты:** **Пётра** і **Алена РЫЖЫЯ**, тэл. **(914) 522 - 0742**, эл. пошта: ***LenaBelarus@aol.com***

**Што будзе:** купальскія песьні й танцы на працягу ўсёй ночы, спартовыя спаборніцтвы й гульні, гатаваньне стравы (прыносьце ежу, грылі там будуць).

**Захапіце з сабою:** - беларускія строі ці адзеньне з сымболікай; дзяўчатам - доўгія спадніцы, хлопцам - доўгія сьветлыя штаны, ня шорты (толькі на час сьвяткаваньня);
- ежу, напоі, спальныя мяшкі, намёты, калі будзеце спаць;
- **$8** (з аўта ў незалежнасьці ад колькасьці пасажыраў) за ўезд у парк (бясплатна пасьля 5-й гадзіны вечара).

Арганізатары забясьпечаць пітную воду і паліва для вогнішчаў і грыляў.

**УВАГА! Колькасьць удзельнікаў абмежаваная (умовамі парку) да 40 чалавек, таму дасылайце рэгістрацыі загадзя.**

# “Шануйце-ж мову нашу, беларускую...”

*(Па тэме выступу на травеньскім Сойме КХП – БНФ)*

*Зянон ПАЗЬНЯК*

### Інтэрмэдыя

У апошні час падняўся традыцыйны шум вакол кампаніі “говори правду” і чарговых людзей, якім далі рэсурсы на выбары ці, па сутнасьці – на легітымізацыю рэжыму (хто даў – ня мае значэньня, бо патэнцыйныя спонсары два: маскоўцы і немцы, і для Беларусі гэта “адзін чорт” – чые грошы, таго й праўда). Людзі абзавяліся тэхнікаю, офісамі, кампутарамі, тэлефонамі, пачалі даваць інтэрвію, шумець (усё па наежджанай дарожцы). І тады, калі ўсё было ўжо ў камплекце, як заўсёды на іх наскочыла міліцыя і КГБ. Забралі тэхніку, офісы, кампутары, тэлефоны, грошы (нават пярсьцёнкі і ўпрыгожваньні спрабавалі рэквізаваць пад выглядамператрусу). Фігурантаў маёмасьці адвезьлі пад арышт, пратрымалі тры дні і выпусьцілі. За гэты час так званыя “незалежныя” СМІ з свайго боку ўшчалі “кампанію галоснасьці”: бралі інтэрвію ў жонак фігурантаў, міліцыянэраў, юрыстаў, вядомых дзеячоў, якія абураліся беззаконьнем улады і г. д.

Фігуранты выйшлі з арышту і сказалі, што іх не запалохаць, і што калі да гэтага, маўляў, пра іхнюю справу ніхто ня ведаў, то цяпер ведаюць усе, улада сама сабе зрабіла горай і г. д. На гэтым заігрaны спэктакаль скончыўся (дакладней, інтэрмэдыя спэктаклю). Усе засталіся пры сваёй выгадзе: міліцыя пры кампутарах, лаптопах, прынтэрах і т. п., фігуранты пры рэкляме, а ўлада пры сіле. Толькі выбаршчыкі павінны-б былі застацца ў дурнях.

Але... хто яго ведае. Выбаршчык ужо зьмяніўся і шмат што стаў разумець. У Марка Твэна, як памятаем, у актораў пагарэлага тэатру кідалі здохлым катом. Беларусы, мяркую, катом кідаца ня будуць, але на рэжымныя выбары наўрад ці пойдуць (і правільна зробяць, нават калі-б акцёры, як у Твэна, распрануліся дагала).

Зрэшты, яны і так ужо распрануліся дастаткова. Нібыта “апазыцыйны” палітычны тэатар даўно замкнуўся на адных і тых-жа выканаўцах. І калі рыхтуецца нешта як бы новае, “рэвалюцыйнае” і т. п. (са старым ці сьвежым спонсарам), тады варта толькі паглядзець склад трупы. І калі заўважым там такія прозьвішчы, як, скажам, спадар Фядута і спадарыня Працька, – затыкайма нос і ўцякайма хутчэй. Маўляў, усё зь імі зразумела і хай не хаваюцца за плечы паэта Някляева. Бо ніякай “праўды” там няма, нічога шчырага і нічога беларускага. Гэта вядомыя спажыўцы чужых рэсурсаў і выканаўцы чужых заказаў (і, адпаведна, чужой палітыкі).

### Каланіялізм і адраджэньне

У самы разгар незразумелай для некаторых акцыі зператрусам, рэквізіцыяй і арыштамі радыё Свабода брала інтэрвію ў спадарыні Працькі (яе не арыштоўвалі і вобыску не рабілі). “Чаму па-беларуску не друкавалі ўлёткі?” – пытаюцца. І Працька адказвае: “Мы зьвяртаемся да насельніцтва, якое размаўляе па-расейску, на расейскай мове. Лепей зьвяртацца на той мове, якую яно разумее, на якой яно будзе пісаць, на якой ня будзе адчуваць сябе непаўнавартасным. Але я хачу адказаць спадару Трусаву вось як. На жаль, у нас у Беларусі беларуская мова – гэта ня проста сродак камунікацыі, як ва ўсіх краінах. Яна у нас – палітычная картка, якую чалавек выстаўляе грамадзтву. Гэта зрабіла ў свой час адна палітычная сіла, яна прыватызавала мову, і на сёньняшні дзень той, хто размаўляе па-беларуску – спытай любога ў нашай вёсцы – гэта бэнээфавец. Чаму так атрымалася? Цяпер можна гэта аналізаваць, але мы ў рэальнай сытуацыі. І калі мы ў рэальнай сытуацыі хочам нешта зрабіць з грамадзтвам, каб яно стала эўрапейскім, увабрала ў сябе і зрабіла нормамі свайго існаваньня і жыцьця сучасныя дэмакратычныя стандарты, мы павінны зыходзіць з тых умоваў і стандартаў, якія мы маем, а не якія мы хацелі-б мець. Калі насельніцтва гаворыць па-расейску, калі беларуская мова ўспрымаецца як прыкмета пэўнай палітычнай сілы, і калі гэтая палітычная сіла з тых ці іншых прычынаў непапулярная, страціла для насельніцтва свае прывабныя якасьці, а мы хочам дасягнуць нейкі вынік ад кампаніі “Гавары праўду”, мы карыстаемся тым, што найлепш нас прывядзе да гэтага выніку”. (http://www.svaboda.org/content/article/2047969.html)

Вось гэта і ёсьць антыбеларуская антымоўная прапаганда, прыдуманая рознымі канторамі і палітычнымі спонсарамі. Такое мы чулі ўжо ад фраў Рабітц, Бэніты Вальднэр, гэра Ганса Віка, фраў Цапф, гэра Фрыка ды іншых гэраў (калі

***Працяг на бачыне 2***

Bielarus569C.qxd 6/13/2010 12:46 AM Page 4



# “Шануйце-ж мову нашу, беларускую...”

*Працяг з бачыны 1*

сягаць глыбей, то яшчэ ад генэрала СС Курта фон Готбэрга). Русіфікатарам заставалася толькі паўтараць нямецкія фармулёўкі.

Тут тыповае выяўленьне каляніяльнае пазыцыі “**статус-кво**”, *якая выходзіць з кансэрвацыі разбуральных вынікаў каляніяльнай палітыкі і сцьвярджэньня іх як нормы жыцьця.*

Альтэрнатываю каляніяльнае палітыцы “статус-кво” ёсьць *пазыцыя нацыянальнага **Адраджэньня**, якое ставіць задачу ліквідацыі каляніяльнае палітыкі і аднаўленьня (адраджэньня) усяго таго, што было разбурана, зглумлена, украдзена, сфальсіфікавана і перайначана каляніяльнымі (акупацыйнымі) уладамі.*

У апраўданьне антыбеларускае палітыкі, рэжым прыдумвае небыліцы. Напрыклад, што пры “нацыяналістах” у 90-х усе расейцы “сядзелі на чамаданах на вакзале”. Гэта тыповая гэбельсаўшчына, нічога падобнага ў прыродзе не існавала. Альбо іншая небыліца (якую агентура часта паўтарае), што насільна ўводзілі беларускія школы і беларускую мову, што на мове размаўлялі толькі “бэнээфовцы” і гэтак далей і да таго падобная прапагандысцкая лухта.

Не было ніякіх “чамаданаў”, ніхто “насільна” не адчыняў школы. Беларускі народ, мову якога саветы пазбавілі афіцыйнага ўжытку, на справе зь вялікай павагай адносіўся да сваёй мовы. І як толькі прыняты быў закон і зьнікла фактычная забарона на мову і на школу – усё пайшло лёгка, амаль што само сабою. Самыя чыноўнікі спрыялі гэтаму добраму працэсу. Людзі хораша спаткалі незалежнасьць і паверылі, што будзе сапраўдная Беларуская дзяржава, і што трэба вучыць дзяцей і вяртаць сваю мову ў афіцыйны ўжытак.

Да мяне на дэпутацкі прыём прыходзілі расейцы, што жывуць у Беларусі, і казалі аб падтрымцы, і што яны аддалі сваіх дзяцей у беларускую школу.

Гэтак будзе і тады, калі абваліцца антыбеларускі рэжым Лукашэнкі, разам са сваёю “апазыцыяй”. (А яны абваляцца.)

Цікава, што галоўныя прапагандысцкія прыдумкі прысутнічаюць тут у адным антымоўным выказваньні Процькі (толькі пра “большасьць насельніцтва” – гэта нямецкі прадукт).

За 70 гадоў рэпрэсіяў, нішчэньня і дэфармацыі беларускага грамадзтва афіцыйная моўная сытуацыя была зрусіфікаваная. Гэтую русіфікацыю за саветамі аб’явілі як “норму” і ўключылі ў палітычную дактрыну КПСС пра “савецкі народ”. Той, хто выступаў за беларускую мову, той ня ўкладваўся ў “норму”, а значыць выступаў супраць гэтага “савецкага” народу (выглядаў антысаветчыкам, а гэта крымінальны артыкул і вельмі жорсткі). Так выглядала “статус-кво” за саветамі.

На барацьбу з савецкай каляніяльнаю палітыкаю стаў Беларускі Народны Фронт. Ён падняў беларускі Бел-Чырвона-Белы сьцяг, выступіў за адраджэньне беларускай культуры, за дзяржаўнасьць беларускае мовы, за дзяржаўную незалежнасьць Беларусі, за ліквідацыю каляніяльнае камуна-маскоўскай сыстэмы, за свабоду і дэмакратыю.

**Фронт выступіў адкрыта і перамог, атрымаўшы падтрымку людзей.** Пад ціскам Фронту пасыпалася камуна-маскоўская акупацыя Беларусі. Упершыню за 200 гадоў мы вярнулі нашую дзяржаўную незалежнасьць, мову, сьцяг і герб на дзяржаўны пасад. Упершыню КГБ СССР атрымаў ад Фронту зубадрабільны ўдар у Курапатах і ў палітыцы незалежнасьці. Упершыню КГБ СССР пацярпеў паразу.

На жаль, пасьля 1991-га савецкая намэнклятура і КГБ здолелі захаваць сваю ўладу ў Беларусі. У канцовым выніку гэта прывяло да рэстаўрацыі антыбеларускага саветызму і прамаскоўскае рэакцыі ў 1994 годзе, узмацніла ролю КГБ ва ўнутранай палітыцы.

Рэстаўрацыя антыбеларускага рэжыму адбывалася па тым-жа каляніяльна-савецкім пляне, як і 75 гадоў таму: ліквідацыя дзяржаўных сымбаляў, зьнішчэньне беларускае школы, падручнікаў, выцясьненьне мовы з афіцыйнага ўжытку, палітычная рэформа правапісу, ліквідацыя беларускіх выдавецтваў, часапісаў, установаў і г. д. – усё па схеме ўнутранай акупацыі, адпрацаванай яшчэ за часы СССР.

Пятнаццацігадовы гвалт над грамадзтвам не мінае бясьсьледна. Зьмены ў грамадзкім становішчы тут-жа стараюцца (як і пры саветах) увесьці ў норму, а ўсялякае змаганьне за нармальнасьць супраць гвалту імкнуцца пазбавіць правоў, аб’яўляюць маргінальным, антынародным і г. д. – усё па старой схеме “статус-кво”.

“Мы павінны, – кажа сп. Процька, – зыходзіць з тых умоваў і стандартаў, якія мы маем, а не якія мы хацелі-б мець”. Вось тут якраз і ёсьць тыповая “ахова” сыстэмы, кансэрвацыя гвалту і дэфармацыі як зыходнай катэгорыі.

Тым часам усялякая сапраўдная барацьба з сыстэмаю гвалту, усялякае адраджэньне і вызвольны рух зыходзяць з тых умоваў, **якія мы хацелі-б мець**, і адмаўляюць тыя ўмовы і стандарты, “якія мы маем”. (А што “мы маем” – вядома.)

Імкненьне зацьвердзіць русіфікацыйныя дэфармацыі рэжыму ў моўнай палітыцы ня ёсьць вынікам памылкі і блытаніцы ў галаве сп. Процькі. Яна гаворыць гэтак-жа, як і сп-ня Ярмошына (адзін да аднаго). Гэта сьветапогляд людзей, выхаваных у камсамоле, якія паразітуюць на нацыянальнай палітыцы, робячы свае (а, фактычна, чужыя) інтарэсы.

Замахнуўшыся на мову, спадарыня Процька занадта далёка зайшла. Ніхто такога цярпець ня будзе ні цяпер, ні потым, калі прыйдзе час разьліку (а ён прыйдзе). Цяпер не 90-я гады, калі трэба было ўсё тлумачыць. Людзі ўжо добра разумеюць, што дыктатарскі рэжым і ягоная “апазыцыя” – гэта адзіная сазлучаная сыстэма самаахавы аўтарытарнай улады. І зьмятаць іх трэба будзе разам. І ўжо сьпее сіла, якая зможа гэта зрабіць.

## Правы чалавека

Русіфікацыя і вынішчэньне беларускае мовы ёсьць задача “нумар адзін” расейскай палітыкі ў Беларусі. Гэтай палітыцы ўжо больш як дзьвесьце гадоў. Пасьля вынішчэньня мовы (тут мы робім умоўнае дапушчэньне для зручнасьці развагаў) Беларусь (яе народ, рэсурсы, вынікі працы, эканоміку і г. д.) Масква ўжо магла-б браць голыма рукамі. Само пытаньне сувэрэнітэту перастала-б існаваць. Калі-б у 80-х, калі ўжо, здавалася, усё было задушана, калі-б тады беларускае грамадзтва ня вылучыла ідэяў, людзей і не стварыла-б Народны Фронт, не пачала-б вяртаць сваю мову, мы-б ужо ня мелі нічога.

Цяперашні час патрабуе Беларускай салідарнасьці – новага Народнага Фронту. Зьяўленьне ў гэты момант розных праплочаных і, фактычна, прарэжымных ініцыятываў, кшталту “говори правду” (“праўду”, якую пасылаюць у адміністрацыю рэжыму), – зьява правакацыйная і сымптаматычная для самазахаваньня гэтага рэжыму. Беларусам ня трэба ў гэтай ініцыятыве ўдзельнічаць, ня трэба раней часу “сьвяціцца” і, да таго-ж, падтрымліваць русіфікацыю.

Хто такая спадарыня Процька, мне вядома (была супрацоўніцаю Інстытуту гісторыі, дзе я працаваў.) Яна не падтрымлівала змаганьне за волю і незалежнасьць, якое вёў БНФ. У часы нацыянальнае рэвалюцыі ў пачатку 90-х Процька стаяла ад яе ў баку. Але калі да ўлады прывялі Лукашэнку, раптам зацікавілася апазыцыйнаю палітыкаю і рознымі сродкамі імкнулася ў яе пралезьці. Гэта ёй удалося не без прыхільнасьці былога намесьніка старшыні КГБ генэрала Лавіцкага.

Магчыма, з гэтае прычыны схаваным зьместам яе “апазыцыйнае” дзейнасьці стала нагаворваньне на БНФ (у вышэйпрыведзенай цытаце таксама), стварэньне яму і ягоным дзеячам адмоўнага вобразу.

Яе гэтую “прысутнасьць” у “палітыцы” мы з С. Навумчыкам спаткалі ў самых неверагодных месцах. У 1996 годзе, калі мы былі ў Варшаве Сяргей Навумчык заходзіць у кабінэт старшыні Польскага Гэльсінскага Камітэту Марэка Навіцкага і каго там бачыць? Спадарыню Процьку, якая сядзіць плячыма да дзьвярэй і на чым сьвет “паліваe” БНФ і Пазьняка, “інфармуе” польскі Камітэт. Разумны Навіцкі даў магчымасьць Сяргею крыху паслухаць, перш чым дэманстратыўна яго заўважыць і спыніць “паліт-інфармацыю”.

У 1996 г., у першыя месяцы вымушанай эміграцыі, мы зь Сяргеем Навумчыкам падпісвалі сумесныя заявы. Я, як старшыня БНФ, і Навумчык, як прадстаўнік Гэльсынскага камітэту. На сустрэчах з палітыкамі ў Кіеве, Празе, Варшаве, Лёндане, Вашынгтоне, Нью-Ёрку, калі нас пыталі, якія грамадзкія арганізацыі трэба падтрымліваць у Беларусі, мы называлі: Гэльсынскі Камітэт і БАЖ. (Дарэчы, С. Навумчык быў сузаснавальнікам і Гэльсынскага Камітэту – нароўні з Быкавым, Брылём, Барадуліным, як дэпутат ВС, – і БАЖу, а ўстаноўчае паседжаньне БАЖу ён нават вёў ад пачатку да канца.)

У 1996-м годзе наступ дыктатуры ў Беларусі ішоў кожны дзень. Сустрэчы з палітыкамі на Захадзе мы выкарыстоўвалі для інфармаваньня аб сытуацыі. Гэта было асабліва неабходна, бо паралельна працаваў намесьнік міністра МЗС Саньнікаў па арганізацыі візыту Лукашэнкі ў Францыю. МЗС імкнуўся прадставіць рэжым Лукашэнкі як нібыта дэмакратычны, варты прыняцьця Эўропаю. Я тады зьвярнуўся зь лістом да прэзыдэнта Шырака з мэтаю затармазіць візіт. Але МЗС удалося ўсё-ж праціснуць прыезд Лукашэнкі.

У 1997-98 гг. мы з С. Навумчыкам працягвалі займацца пытаньнямі правоў чалавека, ініцыявалі і паднялі справу аб Шыдлоўскім, Лабковічу, Кабанчуку (арыштаваных рэжымам). Мне прыйшлося хадзіць ў Г’юман Райтс Вотч у Нью-Ёрку наконт Адамовіча, што сядзеў у гэбісцкай “амэрыканцы”. Я арганізаваў тады шэраг беларускіх дэманстрацыяў ў Нью-Ёрку, лісты ў ААН, Кангрэс ЗША, АБСЭ, Міжнародную Амністыю (езьдзіў у Кангрэс). Сяргей Навумчык выступіў у абарону Севярынца, які сядзеў у віцебскім арышце і г. д. Пачынаючы з 1997 году, мы з Галінай Палачанінай (Пазьняк) на працягу дзесяці гадоў друкавалі у “Беларускіх Ведамасьцях” з нумару ў нумар хроніку парушэньняў правоў чалавека ў Беларусі (праца, якую рыхтаваў БНФ, а патым КХП—БНФ). Вакол нашай працы я ўвесь час спатыкаў дзіўныя акалічнасьці. Але, па-праўдзе, яны мяне не зьдзіўлялі.

“Палітык” Процька (якая ўжо рэгулявала “правы чалавека” ў Беларусі) вядома, не здагадваецца, што “таемны” калектыўны ліст супраць Пазьняка, які ў 1997 годзе быў напісаны ёю, па яе ініцыятыве і зь яе першым подпісам ў Дацкі Гэльсінскі Камітэт і АБСЭ (тады, калі яе ўзначальваў Гэльвіг Пэтэрсэн), што гэты ліст нам адразу быў добра вядомы. (Я быў тады намінантам прэміі па абароне правоў чалавека.) Такія “прыёмчыкі” спадарыні моцна ўразілі непрывычных датчанаў, і яны шмат што зразумелі. Пры гэтым спадарыня Процька дэманстравала мне асабістую павагу і прыязныя адносіны (вельмі цікава было назіраць).

“Апазыцыянэр” Процька пачуваецца, па ўсім відаць, добра. Яна ня ведае, што тыя высокапастаўленыя афіцыйныя асобы ў Вашынгтоне (якім яна распавядала сваю прыдуманую адмоўную “інфармацыю” пра БНФ і пра ягонага старшыню), што тыя асобы былі не прывучаныя трымаць яе “апазыцыйных” сакрэтаў.

Часам “энтузіясты” “працавалі” цэлымі камандамі. У 1997 годзе ў час міжнароднай канфэрэнцыі па правах чалавека ў Варшаве (дзе зачытвалі маё прывітаньне і сардэчна ўспрымалі) па залі хадзіла асоба (ня Процька) і таямніча раздавала улёткі па-ангельску, дзе было напісана, што Пазьняк “экстрэміст” і заклікае да грамадзянскай вайны ў Беларусі. Яны нават у Амэрыку зацягнулі сваю саўковую прапаганду.

Шмат ёсьць яшчэ цікавага ў “тайнай дыпляматыі” спадарыні Процькі, і шмат што мне даўно вядома (але пакінем пакуль). Там, дзе таемнасьць не прадугледжаная, Тацьцяна Процька часта кажа суровую праўду. Ну, напрыклад, цытую: “Как “лукашисты”, так и оппозиционеры, должны четко уяснить: допустить нелегитимного, с точки зрения мирового сообщества, президента – нельзя”. (“Народная Воля”, — 2001, 20 лютага.) Гэта сказана падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году. Проста і зразумела. Тут ужо нават не квазі-апазыцыя, а тыповая “ахоўка” рэжыму.

Заўважана, што адсутнасьць адпору і ўпэўненасьць у беспакаранасьці выклікае часам у людзей такога кшталту поўную дэмаскацыю і адкрытыя паводзіны па абароне рэжыму (яны, кажучы па іхняму, “наглеют”).

Зьдзіўляе, што ў антымоўнай кампаніі Процькі, былых камсамольцаў і ваенных палітработнікаў апынуўся наш выбітны паэт Уладзімер Някляеў. Бо зразумела, што ягоная роля, вызначаная рэжысэрамі ў такой пастаноўцы, – гэта роля ахвярнага ягня ўсяго пагарэлага тэатру. Яе ўжо аднойчы іграў Аляксандар Казулін (так да канца і не зразумеўшы, што адбылося і чаму).

Удзел у чужой палітыцы (ды яшчэ на першай ролі) заканчваецца, як правіла, ахвярапрынашэньнем выканаўцы пасьля выканаваньня ролі.

*Заканчэньне на бачыне 7*

# Беларусь за месяц

## Кандыдатаў паболела

У канцы травеня – пачатку чэрвеня адразу некалькі грамадзкіх дзеячаў заявілі аб прэзыдэнцкіх амбіцыях на будучых выбарах.

29 траўня ў Менску прайшоў чарговы зьезд Партыі БНФ, які, што праўда, праігнаравала частка актыву, у тым ліку і “старая гвардыя” – былыя кіраўнікі партыі Лявон Баршчэўскі і Вінцук Вячорка.

Галоўнаю мэтаю травеньскага зьезду было вызначыцца з фарматам удзелу ў будучых прэзыдэнцкіх выбарах. Большасьць дэлегатаў падтрымала прапанову старшыні партыі Аляксея Янукевіча і прагаласавала за тое, каб выставіць кандыдата ад Партыі БНФ.

У якасьці такой асобы выбралі намесьніка старшыні партыі



**Рыгора Кастусёва** са Шклову. Ён працаваў кіраўніком камунальнай гаспадаркі Шклоўскага раёну, пакуль яго ня выціснулі з працы з прычыны грамадзкай дзейнасьці. Нягледзячы на тое, што Кастусёва называюць “тэхнічным кандыдатам” (маўляў, вылучылі, каб потым зьняўся на карысьць Мілінкевіча), сам ён у інтэрвію Радыё Свабода заявіў, што ні пад нікога здымацца ня будзе. Ды пажартаваў, што Шкловам усё пачалося (Лукашэнка-ж адтуль), Шкловам і скончыцца.

31 травеня ў беларускай сталіцы адбыліся прэзэнтацыі яшчэ двух кандыдатаў. Ад Аб’яднанай грамадзянскай партыі ім стаў намесьнік старшыні, эканаміст і



публіцыст **Яраслаў Раманчук**. Кандыдатуру 44-гадовага намесьніка партыі вылучыла Палітрада АГП. Сам Раманчук заявіў, што ў выпадку ягонай перамогі на выбарах прэм’ер-міністрам стане старшыня партыі Анатоль Лябедзька.

Праграма Раманчука мае назву “Мільён новых працоўных месцаў для Беларусі”. Гэтыя месцы зьбіраюцца стварыць, падтрымліваючы дзейнасьць індывідуальных прадпрымальнікаў, малога і сярэдняга бізнэсу, а таксама замежных інвэстараў. У каманду Раманчука ўвайшлі такія вядомыя асобы, як Анатоль Лябедзькі, Станіслаў Багданкевіч, Леанід Заіка, Аляксандар Сасноў, Васіль Шлындзікаў, Міхаіл Чыгір, Леў Марголін (кіраўнік штабу), Васіль Старавойтаў, Зінаіда Бандарэнка, Сяргей Альфер, Марат Афанасьеў, Анатоль Паўлаў, Віктар Чайчыц, Ігар Шынкарык, Валянціна Палевікова.

У гэты-ж дзень, 31 траўня, свайго кандыдата прэзэнтавала і Беларуская партыя “Зялёныя”. Ім стаў першы намесьнік старшыні партыі 43-гадовы **Юры Глушакоў**. Дарэчы, менавіта ад партыі “зялёных” на выбарах 2006 года быў вылучаны Аляксандар Мілінкевіч. Асноўнымі прынцыпамі сваёй праграмы партыя назвала сацыяльную справядлівасьць, экалягічную бясьпеку і самакіраваньне. Прыкладам, “зялёныя” катэгарычна супраць пабудовы АЭС у Беларусі. Юрый Глушакоў у 1991 г. быў адным з арганізатараў Чарнобыльскага страйку ў Гомелі. У тым-жа 1991-м годзе ўдзельнічаў у абароне “Белага дому” ў Маскве.

Днём пазьней пра свае прэзыдэнцкія амбіцыі заявілі намесьнікі старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі “Гра-



мада” генэрал **Валер Фралоў** і старшыня Вярхоўнага Савету ў



1994—1996 гадох **Мечыслаў Грыб**.

Яшчэ раней за вышэйпералічаных асобаў пра свой удзел у будучых прэзыдэнцкіх выбарах заявілі: лідэр Руху “За Свабоду” **Аляксандар Мілінкевіч**, эксьнамесьнік старшыні Партыі БНФ **Алесь Міхалевіч**, сустаршыня аргкамітэту па стварэньні БХД **Віталь Рымашэўскі**, старшыня аргкамітэту па стварэньні БСДП “Народная Грамада” **Мікола Статкевіч**, каардынатар “Хартыі’97” **Андрэй Саньнікаў**, лідэр Лібэральна-дэмакратычнай партыі **Сяргей Гайдукевіч**. Лукашэнка пакуль афіцыйна пра ўдзел у наступных выбарах не абвяшчаў, але мала хто ў гэтым сумняваецца.

Пра тое, што не выключаюць свой удзел у будучай прэзыдэнцкай кампаніі, заявілі экс-кандыдат у прэзыдэнты на выбарах 2006 года Аляксандар Казулін і лідэр грамадзянскай кампаніі “Гавары праўду” Уладзімер Някляеў.

Зь пералічаных вышэй у выбарчай гонцы 2006 году бралі ўдзел Гайдукевіч, Казулін, Мілінкевіч і Лукашэнка (а ўсяго пра намеры вылучацца заявілі 8 чалавек). Гайдукевіч удзельнічаў у выбарах 2001-га году, а Мілінкевіч у 2001-м кіраваў перадвыбарчым штабам Сямёна Домаша.

## Памёр Міхаіл Паўлаў

З 2000 па 2009 год ён узначальваў Менскі гарвыканкам, зьмяніўшы на гэтай пасадзе Уладзімера Ярмошына. 6 красавіка 2009 года Паўлаў на працы



адчуў моцны галаўны боль, яго даставілі ў шпіталь, дзе потым тамаграфія выявіла дыягназ: пухліна галаўнога мозгу. Апэрацыю зрабілі ў 5-й менскай клініцы. Паўлаў затым лячыўся ў Ізраілі. Потым была праведзена паўторная апэрацыя. Здароўе было моцна падарванае, бо выканаўцам абавязкаў мэра Менску быў прызначаны Мікалай Ладуцька. Было ясна, што Міхаіл Паўлаў на працу ня вернецца. Міхаіл Паўлаў пражыў толькі 57 год. Яго пахавалі на Ўсходніх могілках. Вельмі супярэчлівая фігура, які, што праўда, шмат зрабіў для разбудовы і разьвіцьця сталічнай інфраструктуры беларускай сталіцы.

## Ціск расьце

Газэце “Народная Воля” вынесьлі трэйцяе папярэджаньне. Прычына – публікацыя ў выданьні ўспамінаў Ільлі Копыла “Нябышына. Вайна”. У экспэртным заключэньні Інстытуту гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук зазначаецца, што шэраг прыведзеных у публікацыях гістарычных зьвестак не адпавядае рэчаіснасьці. Прыкладам, ва ўспамінах сьцьвярджалася, што Гіль-Радзівонаў быў Героем Савецкага Саюзу, а да пачатку 1944 г. амаль уся тэрыторыя Беларусі была пад немцамі, тады як быў вызвалены шэраг гарадоў.

Першае папярэджаньне выданьне атрымала ў лістападзе летась за публікацыю ліста Ігара Драко, дзе Міністэрства пабачыла “заклікі да экстрэмісцкай дзейнасьці”. У студзені сёлета газета атрымала папярэджаньне за няправільны пералік газэтных шапікаў, дзе можна падпісацца на “Народную волю” па ільготнай цане.

Дарэчы, закрыць газэту могуць і пасьля другога папярэджаньня. “Народная воля” – адно з найбуйнейшых апазыцыйных выданьняў у Беларусі. Яе наклад – больш за 20 тыс. асобнікаў, газэта выдаецца два разы на тыдзень.

## Рэгістрацыя адмяняецца

У Беларусі не плянуецца ўводзіць абавязковай дзяржаўнай рэгістрацыі электронных паштовых скрыняў. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі.

Дзяржрэгістрацыя інфармацыйных сетак, сыстэмаў і рэсурсаў прадугледжваецца указам №60 “Аб захадах па ўдасканаленьні выкарыстаньня нацыянальнага сэгмэнту сеткі інтэрнэт” ад 1 лютага 2010 году. Першапачаткова плянавалася, што скрыні электроннай пошты, у тым ліку фізычных асобаў, будуць падлягаць рэгістрацыі. Але па выніках перамоваў, якія прайшлі з зацікаўленымі органамі дзяржкіраваньня было прынята рашэньне пра адмену абавязковай рэгістрацыі паштовых скрыняў. Прычым, як юрыдычных, так і фізычных асобаў.

## На кіно няма грошай

Тэлеканал АНТ адмовіўся ад здымак мастацкага кінафільму “Вітаўт”. Замест мастацкай стужкі кіраўніцтва тэлеканалу вырашыла абмежавацца двухсэрыйным дакумэнтальным фільмам. Сярод прычынаў закрыцьця праекту называюцца дзьве — адсутнасьць у тэлеканала грошай на якаснае кіно і ссоўваньне тэрмінаў, да якіх стужка мелася зьявіцца на экранах.

Хадзілі чуткі, што “Вітаўта” плянавалася зьняць да прэзыдэнцкіх выбараў. А ў асобе князя гледачы мусілі ўбачыць фігуру Аляксандра Лукашэнкі – моцную асобу, якая здолела “падняць краіну з каленяў” і гарантаваць яе незалежнасьць ад вонкавых пагрозаў.

## Перадапошняе месца

Беларускі гурт “3+2” заняў перадапошняе месца ў фінале конкурсу эўрапейскае песьні “Эўрабачаньне”, што прайшоў 29 мая ў Осла (Нарвэгія).

Беларусы атрымалі толькі 18 балаў (12 балаў дала Грузія, 3 – Малдова, 2 – Расея. Баўгарыя – 1). А перамагла на Эўрабачаньні немка Лена Маер.

## Кубае Беларусі - у БАТЭ

Шасьціразовы чэмпіён Беларусі па футболе барысаўскі БАТЭ заваяваў Кубак Беларусі. 23 травеня ў фінальным матчы ён разграміў жодзінскае “Тарпэда” – 5:0. Матч прайшоў на сталічным стадыёне “Дынама”.

Гэта ўжо другі сёлета трафей БАТЭ. У сакавіку ён выйграў суперкубак. Барысаўскі клюб ня толькі ў чэмпіянаце краіны, але і пасьля 12 тураў не прапусьціў у свае вароты ніводнага мяча. У ліпені БАТЭ чакае старт у кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў. У другім па значнасьці турніры – Лізе Эўропы – згуляюць менскае “Дынама”, магілёўскі “Дняпро” і жодзінскае “Тарпэда”.

*Уласны карэспандэнт*

## Сустрэчы ў Канадзе

У пачатку чэрвеня Канаду і ЗША наведала дэлегацыя беларускіх палітыкаў і грамадзкіх дзеячаў. У складзе дэлегацыі – тры прадстаўнікі Аб’яднанай грамадзянскай партыі: лідэр партыі Анатоль Лябедзька, ягоны намесьнік Яраслаў Раманчук, міжнародны сакратар партыі Андрэй Дзьмітрыеў, а таксама лідэр грамадзянскай кампаніі “Гавары праўду” Ўладзімер Някляеў.

Беларуская дэлегацыя наведала больш за дзясятак сустрэч і мерапрыемстваў у Канадзе. Гадзінныя слуханьні праходзілі ў парлямэнце Канады, дзе апазыцыянэры пад прысягаю падрабязна праінфармавалі дэпутатаў Канады пра сёньняшнюю сытуацыю ў Беларусі.

“Як вынік – ёсьць ініцыятыва, яна будзе абмяркоўвацца, і мы будзем рабіць усё магчымае для гэтага, каб у парлямэнце была створаная група “За дэмакратычную Беларусь”. Такая заангажаванасьць ёсьць у розных дэпутатаў з розных палітычных сілаў, і гэта дае спадзяваньні, што такі пункт пляну будзе практычна рэалізаваны. Натуральна, што гэтым мы ствараем доўгатэрміновую пляцоўку для працы ў Канадзе”, – адзначыў спадар Лябедзька.



А. Лябедзька

Беларуская дэлегацыя сустракалася таксама зь міністрам міграцыі і міністрам зьнешняга гандлю, а таксама з прэм’ер-міністрам Канады Стывэнам Харпэрам.

У Нацыянальным прэсавым цэнтры Канады адбылася прэс канфэрэнцыя беларускай дэлегацыі, а таксама сустрэча з прадстаўнікамі дзелавых колаў. На апошняй абмяркоўваліся пэрпэктывы правядзеньня інвэстыцыйнага форуму ў Менску.

“Мы зь Яраславам Раманчуком рабілі прэзэнтацыю праграмы “Мільён новых працоўных месцаў” і адзначаем, што гэта абсалютна рэалістычны праект. І калі-б нам далі рабіць яго ў Беларусі, то 100% гарантыі, што мы прыцягнулі-б мільярды даляраў патэнцыйных канадзкіх інвэстыцый. Гэта чыстыя грошы, за якія ня трэба турбавацца, якія маглі-б працаваць у тым ліку і на эканамічныя інтарэсы Беларусі і амаль 10 мільёнаў яе грамадзянаў”, – адзначыў старшыня АГП.

“Мы абсалютна задаволеныя гэтай паездкай”, – сказаў Анатоль Лябедзька.

*Паводле Радыё Свабода*

Bielarus569C.qxd 6/13/2010 12:47 AM Page 6



# Каляндар “БЕЛАРУСА”

**29 траўня 1970 году** ў Вільпэне пад Парыжам пасьля цяжкой хваробы памёр прэзыдэнт БНР **Мікола Абрамчык**.



Ён быў прэзыдэнтам Рады БНР з 1947 па 1970 гады. Ягоным пераемнікам стаў Вінцэнт Жук-Грышкевіч.

65 гадоў таму, **6 чэрвеня 1945 году**, быў створаны **Беларускі нацыянальны камітэт** у Рэгенсбургу (Баварыя). Камітэт заснаваў Аляксандар Русак (падрабязьней пра гэтую асобу чытайце ў артыкуле В.Кіпеля (№ 556, травень 2009 г.).

У хуткім часе БНК стаў галоўным прадстаўніцтвам беларускай эміграцыі ў амэрыканскай зоне акупацыі Нямеччыны. Ад яго і пачалося беларускае жыцьцё ў паваенных лягерох.

У **6 чэрвеня 1975 году** памёр **Барыс Шчорс**. Іх было трое



братоў Шчорсаў – Мікола, Ігар і Барыс. Барыс быў сярэднім. Ён нарадзіўся ў 1916 годзе ў Новым Сьверажні пад Стоўпцамі. Некалькі чалавек, калі не дзясяткі, з Н. Сьвержня апынуліся па вайне на эміграцыі. Барыс Шчорс у паваеннай Нямеччыне быў камэндантам лягера ў Міхельсдорфе. У 1949 г. перабраўся ў ЗША, пасяліўся ў Саўт-Рывэры. У гарадку Шчорс-сярэдні быў адным з матораў беларускага грамадзкага жыцьця. Узначаліў Беларускі выдавецкі фонд, уваходзіў у рэдкалегію часапіса “Беларуская думка”. Быў ініцыятарам пабудовы Беларускага грамадзкага цэнтру пры царкве сьв. Эўфрасіньні Полацкай.

*“Барыс быў чалавек на ўсе рукі: інтэлігент, арганізатар, будаўнік. Як ён памёр, у нас многае завалілася. Ён вёў усё. Барыс быў сапраўдны беларускі дзеяч. Як ён памёр, то ўся царква плакала. Мой муж ня мог пагадзіцца, як такі чалавек адышоў у 63 гады”,* – згадвае Ліза Літаровіч.

**15 чэрвеня 1900 году** ў Вялікіх Азяранах на Гарадзеншчыне нарадзіўся **Ўладзімер Тамашчык**. У. Тамашчык быў адным з аднаўляльнікаў Рады БНР у 1947 г. і блізкіх паплечнікаў яе прэзыдэнта Міколы Абрамчыка. Мог у Радзе БНР зрабіць добрую кар’еру, але жыцьцё распарадзілася інакш.

У 1946 г. япіскапы Беларускай аўтакефальнай царквы перайшлі ў юрысдыкцыю РЗПЦ, і беларусы на эміграцыі засталіся без свайго кіраўніцтва. Пасьля доўгіх і безвыніковых спробаў пераканаць ярархаў вярнуцца, Рада БНР прыняла рашэньне аб высьвячэньні будучага беларускага япіскапа. Паколькі кандыдатаў зь ліку духоўных асобаў не было, вырашылі выбраць кандыдата з трох сьвецкіх асобаў: тагачаснага кіраўніка Беларускага нацыянальнага камітэту, намесьніка старшыні Сусьветнага аб’яданьня бел. эміграцыі Ўладзімера Тамашчыка, журналіста Ўладзімера Бортніка ды дзеяча Міколы Дзямідава. Выбар паў на Тамашчыка, які спачатку быў пастрыжаны ў манахі пад імем Васіль, а ў сьнежні 1949 г. у нямецкім Розэнгайме хіратанізаваны ў япіскапы БАПЦ. У 1950 г. ён перабраўся ў Нью-Ёрк. Жыцьцё ў гэтым горадзе не было для яго спакойным. Пры актыўным удзеле япіскапа раскалолася нью-ёрская парафія. Сам-жа япіскап Васіль памёр пры загадкавых абставінах 9 чэрвеня 1970 году.

**20 чэрвеня 1925 году** на Смаргоншчыне нарадзіўся **Янка Сурвілла**. Ён пакінуў радзіму ўвосень 1943 г. – партызаны спалілі школу ў Данюшаве, дзе ён настаўнічаў, ды пагражалі распраўй і самому настаўніку.



Працаваў у камітэце Самапомачы ў Бэрліне, па вайне апынуўся ў лягеры ў Ватэнштэце, займаўся выдавецкай дзейнасьцю – выдаваў “Шляхам жыцьця”.

Быў сябрам Рады БНР ад 1948 г. У 1951 г. Янка Сурвілла перабраўся ў Мадрыд – ён атрымаў стыпэндыю на навучаньне ва ўнівэрсытэце. У 1958 годзе разам з Віктарам Сянкевічам заснаваў беларускую рэдакцыю на Гішпанскім нацыянальным радыё. Гэтыя перадачы праіснавалі да 1965 г. У 1969 Янка і Івонка Сурвілы пераехалі ў Канаду, дзе далучыліся да актыўнага грамадзкага жыцьця. Янка Сурвілла памёр у чэрвені 1997 году.

**АГ**

# Вечар памяці ў Вільні

У Вільні, у Доме нацыянальных згуртаваньняў, 8-га траўня сёлета адбыўся вечар памяці, прысьвечаны 110-м угодкам зь дня нараджэньня інжынэра, беларускага грамадзкага дзеяча, былога палітычнага вязьня Адольфа Клімовіча.

З паведамленьнямі аб гэтым, у свой час шырока вядомым у беларускім сьвеце, але на сёньня напаўзабытым і да крыўднага рэдка ўзгадваемым, чалавеку выступілі: журналіст, сябра Саюзу беларускіх пісьменьнікаў Сяргей Дубавец; журналістка, супрацоўніца газэты “Астравецкая праўда” Ганна Чакур; дырэктар грамадзкай арганізацыі “Віленскі беларускі музэй імя І. Луцкевіча” Людвіка Кардзіс; краязнаўца, рэдактар і выдавец часапіса “Куфэрак Віленшчыны”, аўтар кнігі “Нашчадак слаўных крывічоў” (Мн., 2008) Міхась Казлоўскі.

Вялікую цікавасьць у прысутных выклікала невялічкая, але зьмястоўная, з густам і неардынарна аформленая выстава асабістых рэчаў , фатаздымкаў, дакумэнтаў, кніг зь бібліятэкі Адольфа Клімовіча, якую разгарнуў “Віленскі беларускі музэй імя І. Луцкевіча”.

У выкананьні вучняў Віленскай сярэдняй школы імя Ф. Скарыны прагучалі вершы Ларысы Геніюш.

Акторка Рускага драматычнага тэатру Летувы Любоў Цімохава прачытала “Баляду Адольфа Клімовіча” (аўтар Віктар Шніп).

А завяршылася імпрэза песьняй “Залатая сонца калясьніца” на словы Ларысы Геніюш у выкананьні вядомага музыкі, фальклярыста і барда Алеся Лося (у запісе).

Залю, у якой праходзіў вечар, упрыгожвалі тры сьцягі: летувіскі, Эўразьвязу, бел-чырвона-белы беларускі і партрэт Адольфа Клімовіча працы Пётры Сергіевіча.

Арганізавала вечар Віленскае беларускае таварыства палітычных вязьняў і ссыльных пры дапамозе і непасрэдным удзеле Віленскай сярэдняй школы імя Ф. Скарыны і грамадзкай арганізацыі “Віленскі беларускі музэй імя І. Луцкевіча”.

На наступны дзень Міраслава Русак накрылы ў сябе па прапанове і дапамозе Вольгі Саковіч шыкоўны стол. Шыкоўны настолькі, што давялося прасіць у будучым так не выкладвацца, інакш мы хутка вычарпаем свае і без таго кволыя сілы.

Шчыры усім дзякуй!

***Валянцін СТЭХ, Старшыня Віленскага беларускага таварыства палітычных вязьняў і ссыльных***

**Prastora.by** – інтэрнэт-крама кнігаў на беларускай мове. Тут вас чакае вялікі выбар мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры, новыя выданьні, а таксама рэдкія кнігі. Побач з кнігамі на нашых віртуальных паліцах аўдыёкнігі, музычныя кампакт-дыскі, відэа, сувэніры ды іншыя беларускія тавары. Даступныя цэны, зручныя спосабы аплаты, дастаўка па ўсім сьвеце!

Замову можна зрабіць па тэлефоне або даслаць на e-mail, аформіць непасрэдна праз сайт ці пры дапамозе сэрвісу Skype. Падрабязная інфармацыя на нашым сайце *www.Prastora.by*

Зычым усім беларусам паболей беларускае прасторы наўкола!

***Каманда Prastora.by***

***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне і Згуртаваньне Беларусаў Канады запрашаюць усіх беларусаў на***

## 29-ю Сустрэчу Беларусаў Паўночнай Амэрыкі,

***якая адбудзецца 4-6 верасьня 2010 г. у штаце Нью-Джэрзі.***

***У праграме Сустрэчы:***

**4 верасьня** – Канфэрэнцыя “Змаганьне за Вольную Беларусь: 600 гадоў Грунвальдскай бітвы, 90 гадоў Слуцкаму Збройнаму Чыну”.
Апаўдні – буфэт.
Адзначэньне 100-годзьдзя Ларысы Геніюш.
Баль Сустрэчы.

**5 верасьня** – Банкет і канцэрт, пачатак а 1-й гадзіне папаўдні. Выступы музыкаў, фальклёрных выканаўцаў.

**6 верасьня** – Ад’езд удзельнікаў.

Сустрэчу плянуецца правесьці ў гатэлі Гаят:
***Hyatt Regency, 2 Albany Street, New Brunswick, NJ 08901***
*Больш інфармацыі будзе ў наступным нумары “Беларуса”.*

# ПАДПІСКА

## на выданьні зь Беларусі на другую палову 2010 году

## З дасылкаю зь Беларусі ў замежжа:

| | *Назва, выдавец, мова* | *Пэрыядыч. друку* | *Кошт, $* |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 75 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 32 |
| Часапісы: | **Arche**, прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 100 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 32 |

## Жыхарам Беларусі:

(Зрабіце вартасны падарунак сваім родным ці знаёмым у Беларусі - выпішыце ім беларускія выданьні, аплаціўшы выдаткі ў ЗША)

| | *Назва, выдавец, мова* | *Пэрыядыч. друку* | *Кошт, $* |
|---|---|---|---|
| Газэты: | **Наша Ніва**, прыватная, беларуская | 4 на месяц | 20 |
| | **Наша Слова**, ТБМ, беларуская | 4 на месяц | 8 |
| | **Народная Воля,** прыват., бел., рас. | 16 на месяц | 25 |
| Часапісы: | **Arche,** прыватны, беларуская | 5 на 6 месяцаў | 25 |
| | **Дзеяслоў**, прыватны, беларуская | 3 на 6 месяцаў | 12 |
| | **Краязнаўчая газэта**, беларуская | 4 на месяц | 12 |

Вы можаце выпісаць і іншыя выданьні зь Беларусі. Па інфармацыю зьвяртайцеся на адрас: *hazetabielarus@att.net*

***Заўвага:*** *газэты дасылаюцца авіяпоштаю, часапісы звычайнаю.*

***Дасылайце замовы на падпіску і аплату да 15 чэрвеня 2010 г. на адрас:***
***BIELARUS, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735.***

***Чэкі, калі ласка, выпісвайце на імя BIELARUS.***

Bielarus569C.qxd 6/13/2010 12:47 AM Page 7





# Весткі й Паведамленьні

Нью-Ёрскага аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня

Viestki j Paviedamlenni

Belarusan American Association, Inc.

166-34 Gothic Drive, Jamaica, N.Y. 11432 Сусьветная сеціва: www.baza-belarus.org № 6 (533)



## Травеньскі сход нью-ёрскага аддзелу БАЗА

У суботу, 15 травеня, у Міжнародным Доме Маракоў на Мангэтане адбыўся справаздачна-выбарчы сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА. Напачатку сходу была абраная выбарчая камісія ў складзе: Валянціна Балашчанка – старшыня, Ільля Куніцкі – сакратар, Віктар Едзіновіч і Зьміцер Левіт – сябры. Затым адбылася рэгістрацыя сяброў, маючых права голасу. Агульны пашыраны сьпіс уключаў асобаў, частка зь якіх заплаціла складкі за мінулыя гады, але не за апошні й бягучы гады. З агульнага сьпісу з 184 сяброў, маючымі права голасу прызнаныя 64 асобы. Прысутных на сходзе сяброў з правам голасу аказалася 26 чалавек, і 5 чалавек перадалі свае ўпаўнаваньні. Перад галасаваньнем за кандыдатуру старшыні аддзелу зьявілася яшчэ адная асоба з правам голасу.

Перад прысутнымі з справаздачамі выступілі старшыня Нью-Ёрскага аддзелу Віталь Зайка, сакратар Валянціна Якімовіч;. Сп. Зайка таксама паведаміў пра стан касы аддзелу, а пазьней скарбнік Мікола Ціма-шэнка даў дакладнейшыя зьвесткі па фінансах аддзелу.

Падчас высоўваньня кандыдатураў на пасаду старшыні аддзелу паступіла толькі адная прапанова кандыдатура – сп. В. Зайкі. Прысутны на сходзе сп. Вячка Станкевіч, што ня ёсьць сябрам аддзелу, і якога аддзел, дарэчы, не прызнае кіраўніком БАЗА, выказваючыся без дазволу вядучай старшыні выбарчага сходу, відавочна меў намер справакаваць зрыў сходу. Нягледзячы на тое, што яму не было дадзена слова, і што ён не зьяўляецца сябрам Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, сп. Станкевіч гвалтам імкнуўся, цытуючы Статут БАЗА, давесьці, што сход неправамоцны, і выбары на ім адбываюцца ня могуць, бо быццам "няма кворуму". Пры гэтым сп. Станкевіча, які не лічыў галасы і ня меў дачыненьня да выбарчай камісіі, не цікавіў сапраўдны стан рэчаў. Перад самым галасаваньнем спраўджаная колькасьць галасоў склала 32 чалавекі, г. зн. акурат кворум.

Цяжка паверыць, што гэткі заняты чалавек, як сп. Станкевіч, адмыслова прыехаў зь Нью-Джэрзі, каб працытаваць некалькі сказаў са Статуту. Відавочна, гэта быў крок, разьлічаны на дыскрэдытацыю кіраўніцтва аддзелу БАЗА ў рамках кампаніі, якую сп. Станкевіч адкрыта пачаў яшчэ год назад. Перад гэтым сп. Станкевіч удвох з прысутным сп. Валерам Дворнікам сталі ставіць правакацыйныя пытаньні старшыні Нью-Ёрскага аддзелу, у тым ліку "чаму сход праводзіцца ў гэтым памешканьні, за якое трэба плаціць вялікія грошы". Пытаньне само па сабе ёсьць вельмі цынічнае, бо менавіта абодва цікаўныя запытальнікі, Станкевіч і Дворнік, спрычыніліся да таго, што Нью-Ёрскі аддзел апынуўся на вуліцы праз фактычную адмову праводзіць сходы ў Фундацыі імя Крэчэўскага ў Кўінзе, у месцы, дзе аддзел зьбіраўся дзясяткі гадоў. Бачачы, што спроба правакацыі ня мае посьпеху, абодва яе ініцыятары пакінулі сход.

Сп. Зайка распавёў аб сваёй выбарчай праграме, пералічыўшы пункты дзейнасьці, на якіх хацеў-бы засярэдзіць ўвагу на наступны тэрмін старшынства.

У выніку галасаваньня сп. Зайка быў аднагалосна пераабраны старшынём Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА яшчэ на адзін год.

Сп. Зайка прапанаваў новы склад управы БАЗА ў складзе: М. Клакоцкі (заступнік), А. Міцкевіч (ганаровы старшыня), В. Якімовіч (сакратар), М. Цімашэнка (скарбнік), А. Шукелойць, Э. Рыжы, В. Балашчанка, І. Куніцкі. Склад быў зацьверджаны пры адным голасе, што ўстрымаўся. У рэвізійную камісію, зацьверджаную аднагалосна, увайшлі З. Левіт (старшыня камісіі), Т. Кулакевіч, В. Едзіновіч.

Пасьля сходу адбылося паседжаньне новай управы аддзелу.

**Віталь ЗАЙКА**

## Непаразуменьні зь месцам правядзеньня чэрвеньскага сходу аддзелу

Працягваюцца выпрабаваньні Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА, зьвязаныя з памешканьнем для правядзеньня штомесячных сходаў арганізацыі. Нагадаем чытачам, што з красавіка бягучага году Фундацыя імя Крэчэўскага зачыненая на рамонт, і на травеньскім сходзе аддзелу, які быў справаздачна-выбарчым, незапрашаны туды старшыня Фундацыі Вячка Станкевіч, між іншага, спытаў, чаму гэта аддзел не зьвернецца да сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне ў справе памешканьня.

На паседжаньні ўправы Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА 15 траўня было вырашана зьвярнуцца да сп. Станкевіча з пытаньнем, калі ў Фундацыі скончыцца рамонт, і калі заля Фундацыі ізноў будзе даступная для грамадзкіх імпрэзаў. Таксама было пастаноўлена ў міжчасе зьвярнуцца да парафіяльнай рады сабору сьв. Кірылы Тураўскага ў справе арэнды грамадзкай залі для сходаў.

На пытаньне адносна залі ў Фундацыі адказу ад сп. Станкевіча дасюль не атрымана. У справе залі пры саборы была заключаная вусная дамова з адказным за арэнду залі прадстаўніком парафіі сп. В. Кузьменкам, які запэўніў, што перашкодаў для правядзеньня сходу ня будзе. Але неўзабаве старшыня парафіі сп. Расьціслаў Гарошка электронна даслаў ліст, дзе напісаў, што да яго быццам дайшлі чуткі, што аддзел БАЗА "плянуе паварот да парафіяльнай залі" і, што патрэбны афіцыйны зварот аб гэтым да парафіяльнай рады. Адразу-ж, 26 траўня, такая просьба была адасланая.

Амаль праз два тыдні, 6 чэрвеня, быў атрыманы адказ ад сп. Гарошкі з тэкстам "пазволу" на правядзеньне сходу з сумаю аплаты (125 дал.) і наступнымі ўмовамі:

– "Пасьведка страхоўкі павінна быць даручаная прадстаўніку парафіяльнай рады перад пачаткам сходу, так як вымагаюць законы штату Нью-Ёрк. Без страхоўкі сход ня можа адбыцца.

– На царкоўнай маёмасьці збор грошай можа адбывацца толькі на мэты, зацьверджаныя парафіяльнаю Радаю.

– "Бізнэс" Нью-Ёрскага аддзелу – выпісваньне іміграцыйных папераў – ня можа адбывацца на царкоўнай маёмасьці.

– Нью-Ёрскі аддзел БАЗА ня можа карыстацца царкоўным адрасам або царкоўным тэлефонам без дазволу парафіяльнай рады."

На пытаньне пра атрыманьне страхоўкі, пра тое, што такое "бізнэс" Нью-Ёрскага аддзелу і, чаму парафіяльная рада ўмешваецца ва ўнутраныя справы аддзелу, зьвязаныя са зьместам сходаў, адказу не было атрымана. Пазьней, літаральна за некалькі дзён прыйшоў адказ наконт страхоўкі, але зноў не было патлумачана сутнасьць гэтае справы. Кіраўніцтва аддзелу было змушанае зноў зьвярнуцца па залю да чужых людзей, у той час як землякі-беларусы фактычна адмовілі Нью-Ёрскаму аддзелу ў такой паслузе.

Цікава, што ў 1980-я гады пад тым-жа прэтэкстам "страхоўкі" ў саборы не былі дазволеныя сходы сяброў беларускага танцавальнага гуртка "Васілёк", а зусім нядаўна пад той-жа прычыне быў выстаўлены з сабору "Беларускі Музэй". Зьвяртае на сябе ўвагу таксама запатрабаваны кошт арэнды, 125 дал. – па словах некаторых кампэтэнтных парафіянаў сабору, з пэўных амэрыканскіх арганізацыяў аплата за арэнду залі сабору бярэцца ў 3 разы меншая, чым тая, якую прапанавана плаціць Нью-Ёрскаму аддзелу БАЗА.

У гэты самы час зь ліку сяброў парафіяльнай рады быў створаны т. зв. "Бруклінскі аддзел БАЗА". Большасьць зь іх – таксама сябры т. зв. "Галоўнай управы", створаная сп. Станкевічам на праведзеным з хібамі й парушэньнямі Кангрэсе БАЗА 30 траўня 2009 г. Адмовіўшыся правесьці Надзвычайны Кангрэс, сп. Станкевіч паставіў сябе па-за Беларуска-Амэрыканскім Задзіночаньнем і ня быў прызнаны аддзеламі БАЗА ў Нью-Ёрку і Нью-Джэрзі. Зрабіўшыся "генэралам бяз войска", сп. Станкевіч стварыў з шэрагу сваіх паплечнікаў імітацыю аддзелу, каб хоць неяк замаскаваць сваю непрызнанасьць.

У гэтай сувязі цікава было-б спытаць, ці дамовілася парафіяльная рада з новаствораным "аддзелам БАЗА" ў Брукліне аб страхоўцы і арэнднай плаце, па якіх коштах, і колькі часу цягнулася залатвеньне гэтых пытаньняў. Таксама цікава, колькі плоціць за свае паседжаньні ў залі сабору т. зв. "Галоўная ўправа" сп. Станевіча. Выглядае, што парафіяльная рада сабору сьв. Кірылы Тураўскага Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы (БАПЦ) кантралюецца сп. Вячкам Станкевічам, які ня ёсьць, наколькі вядома, вернікам БАПЦ.

Тымчасам Нью-Ёрскі аддзел БАЗА працягвае пошук памешканьня. Свае прапановы і парады просьба дасылаць на е-мэйл, што на сайце Baza-belarus.org.

**Віталь ЗАЙКА**

### УВАГА! Месца сходу зьмянілася!

**ЧЭРВЕНЬСКІ СХОД** *Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца ў суботу **12-га чэрвеня 2010 году** ў Міжнародным Доме Марака на Мангэтане. Пачатак сходу а 6-й гадзіне вечара.*

*Дакладны адрас Дому Марака:*

***Seafarers and International House,***

***123 East 15th Street (at Irving Place),***

***New York, NY 10003.***

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынку **Union Square**.*

*Заля для сходаў знаходзіцца на другім паверсе будынка.*

**ЛІПЕНЬСКІ СХОД** *Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА адбудзецца ў **НЯДЗЕЛЮ, 18 ліпеня 2010 г.** у Цэнтральным парку на Мангэтане*

*Пачатак сходу а **2-й гадзіне папаўдні.***

***Месца правядзеньня:** у Цэнтральным парку насупраць 79-й вуліцы на ўсходнім баку Чарапашай сажалкі ля помніка Каралю Польскаму і Вялікаму князю Літоўскаму Ягайлу. (Насупраць Бэльвэдэрскага замку.)*

*Збор каля помніка каралю і вялікаму князю старабеларускай дзяржавы Ўладзіславу Ягайлу, што стаў каралём і ўзначаліў войскі польска-літоўскай дзяржавы ў бітве пад Грунвальдам. Якраз у гэтыя дні, 15 ліпеня, спаўняецца 600 гадоў перамогі пад Грунвальдам, дзе большасьць войска Вялікага Княства Літоўскага складалі беларускія ваяры.*

## Нашая фанатэка

# Шчасьлівая нумэралёгія Шалкевіча




Вядомы гарадзенскі бард Віктар Шалкевіч адзначыў сваё 50-годзьдзе. Такая выдатная дата ў жыцьці чалавека — заўсёды падстава для падрахункаваньня ўсяго жыцьцёвага досьведу, а для слухачоў і музычных крытыкаў — нагода для асэнсаваньня фэнамэну творчай адметнасьці артыста. А яшчэ для выданьня юбілейнай кружэлкі, такой як "Шчасьлівая сямёрка". Гэтым канцэртным альбомам Шалкевіч падвёў вынікі сваёй шматгадовай творчай дзейнасьці і стварыў падставу для канцэртупрэзэнтацыі ў сталіцы.

Што тычыцца Шалкевіча-барда, то ягоны шлях як выканаўцы і аўтара ў многім вызначаецца ягонаю унівэрсальнаю асобаю. Ад школы акторскага майстэрства, якую Віктар прайшоў у гарадзенскім Тэатры лялек, выканаўца ўзяў уменьне "пражываць" музычны твор — ладзіць своеасаблівы міні-спэктакаль, пад час якога, дзякуючы акторскім здольнасьцям, выканаўца яскрава даносіць да слухача асноўны зьмест і сэнс музычнай кампазыцыі. Ці то драматычнай, лірычнай, ці то сатырычнай... Ад вопыту вядзеньня аўкцыёнаў у Шалкевіча ўменьне імправізаваць, "гумарыць" у нязмушанай форме, адным словам, весьці са слухачамі даверлівую размову, дыялёг, ствараць у канцэртнай залі атмасфэру сябрыны і беларускай салідарнасьці...

Калі артыстычныя ды імправізацыйныя здольнасьці Шалкевіча — у нейкім сэньсе, вынік ягонай прафэсійнай падрыхтоўкі, то прыхільнасьць барда да разнастайных музычных плыняў — ад густу і выхаваньня. У ягоных песьнях неяк вельмі арганічна і "мірна" спалучаюцца вулічны шансон і рок, лірычная баляда і рытмы правінцыйных прыпевак, блюз і кабарэтная мэлядычныя матывы. У той-жа час, творчасьць Віктара Шалкевіча амаль цалкам пазбаўленая так званых "КСПэшных" рысаў. Нагадаю, КСП – "клубы самадзейнай песьні", якія на працягу свайго існаваньня заставаліся крыніцай расейскага ўплыву на бардаўскі рух у краінах былога СССР. Ягоным ўдзельнікам убіваліся ў галаву мэлядычныя, кампазыцыйныя і моўныя матрыцы Акуджавы, Візбара і Нікіціна (хоць ніхто не зьбіраецца адмаўляць іхны унёсак у расейскую культуру і бардаўскі рух гэтай краіны), што спрадзіла легіён іх безаблічных эпігонаў. Але гэта не пра Шалкевіча, які сёньня ўспрымаецца як адзін са стваральнікаў і захоўнікаў традыцый творча незалежнага беларускамоўнага бардаўскага руху. А гэты факт – самавіты вынік творчасьці пяцідзесяцігадовага артыста, які ў год свайго юбілею прадставіў альбом "Шчасьлівая сямёрка". Назва дыску адлюстроўвае той факт, што ў дыскаграфіі Шалкевіча гэты дыск сёмы па ліку, а лічба сем – па агульнаму меркаваньню – шчасьлівая! З гэтым зьвязаныя далейшыя творчыя спадзяваньні і пляны выканаўцы.

У дыскаграфіі гарадзенскага аўтара ёсьць аўтарскія альбомы ("Смутны беларускі блюз", "За сто крокаў ад Вострае брамы..."), тэматычныя складанкі ("Баляды і рамансы"), канцэртныя праграмы ("Гарадзенец прызямліўся ў Менску") і выбранае з сэрыі "Беларускі музычны архіў" ("Добрай раніцы"). І вось чарговая канцэртовая праграма з песьнямі, якія раней не выдаваліся на кружэлках. Акрамя гэтага, на дыску прадстаўленыя гіты Віктара Шалкевіча мінулых гадоў (толькі адна "Кароткая гісторыя Беларусі" чаго каштуе!), якія запісаныя ў хадавым цяпер фармаце mp3.

Не цяжка заўважыць, што выдадзены дыск Шалкевіча мае падзагаловак "Новыя песьні і анэкдоты". Таму першы трэк





альбому – амаль літаратурная прыпавесьць да песень, зь якімі слухачы яшчэ не пасьпелі пазнаёміцца. Віктар і далей нястомна распавядае пра тое, як стваралася тая ці іншая кампазыцыя. Здаецца, што Шалкевіч-распавядальнік забываецца на сваё перадвызначэньне музыкі і сьпевака...

Але зь першых-жа акордаў наступнай кампазыцыі "Такая доўгая зіма" становіцца зразумелым, што Шалкевіч застаецца такім, якім яго ведаюць слухачы – крыху філязафічным, крыху саркастычным і зусім кроплю акадэмічным. Гэтая песьня ў Шалкевіча атрымалася пранікнёнаю, упрыгожаною мінорнымі аскепкамі ягоных дзяцячых успамінаў і, у нейкай ступені, адпаведнай юбілейным настроям пяцідзесяцігадовага чалавека.

Чарговы трэк альбому – "Баляда пра жэншчыну" своеасаблівая даніна "трасянковай" традыцыі ў творчасьці Віктара Шалкевіча. Сапраўды, цяжка стрымацца ад пароды і сарказма, калі сюжэты новых песень самі знаходзяць аўтара. Вось і сюжэт "Баляды..." быў "падслуханы" Шалкевічам у электрычцы Менск-Маладэчна. Яе распавядальнік нават не ўяўляў, што ягоная гісторыя стане падставаю для сямейнае сагі ад Віктоара Шалкевіча. Цяперака яна "пайшла ў народ", і яе цытуюць фразамі: "На сьвеце многа дзевушак і жэншчын, но лічна я відал іх всех у грабу!"

Наступную песьню бард ахарактарызаваў як "лірыка чалавека, якому за пяцьдзесят". Шалкевіч меў на ўвазе настальгічную кампазыцыю "Лета, якое мы змарнавалі". У песьні скразной тэмаю зьяўляецца шкадаваньне пра тое, што не ўдалося па-сапраўднаму адчуць цудоўную беларускую прыроду, зьліцца зь ёю, шкадаваньне аб тым, што "дзяўчаты высокія, гожыя, будуць іншых, ня нас абдымаць..." Але ў аўтара застаецца надзея, што, негледзячы на дэфіцыт часу, калінебудзь у нас усіх зьявіцца магчымасьць адчуць непарыўную сувязь з роднаю зямлёю.

Яшчэ адна магістральная тэма ў творчасьці барда – лёс і сёньняшні дзень беларускай правінцыі. "Баляда пра Валожын" – адзін з прыкладаў такіх музычных прысьвячэньняў. Негледзячы на тое, што Шалкевіч ў сэрцах несправядліва ўсклікае, маўляў: "Ах, Божа мой! Ах, Божа мой! Чаму так сумна ў Валожыне?", гэты твор – сапраўдны гімн і прызнаньне ў любові да гэтага старажытнага беларускага мястэчка і ягоных жыхароў – сардэчных, шчырых і працалюбівых.

Музычна-палітычныя замалёўкі "на злобу дня" – візітоўка барда Віктара Шалкевіча. Менавіта песьні такога жанру і кшталту становяцца асноваю для ягоных канцэртных праграмаў. Вось і на альбоме "Шчасьлівая сямёрка" ёсьць магчымасьць успомніць пра талент Шалкевічасатырыка. Першая песьня з сатырычнага разьдзелу новага альбому – "Голуб на сяквоі, галубка на пальме", якая ёсьць тэматычным пераасэнсаваньнем фальклёрнай апрацоўкі ад гурта "Ліцьвіны". Гэтая песьня прысьвечаная амбасадару Швэцыі ў Беларусі Стэфану Эрыксану, дарэчы, выдатнаму знаўцу беларускай мовы і гісторыі. Але ў песьні ёсьць і сумная нота, бо ў ёй распавядаецца пра беларусаў, якія па псеўдапалітычных матывах кідаюць сваю радзіму і зьяжджаюць на Захад з мэркантыльнымі мэтамі.

Яшчэ адная баляда, якую можна назваць "непаліткарэктнай" – "Новыя хвалі Радыё "Свабода". Твор прымушае задумацца над будучыняй некаторых прадстаўнікоў апазыцыйных сілаў, якія часам у стане толькі ствараць "буру ў шклянцы, а шклянка – у дзьвесьце грам!" Такім-жа марнатраўным тыпам жыцьцёвай апатыі пакутуе і "лірычны герой" іншай песьні Шалкевіча – "Маналёга старога інтэрнэт-юзэра". А вось "Баляда пра "Славянскі базар" – чарговы гіт барда, на які зьвернуць увагу ўсе без выключэньня слухачы новага дыску. Гэта можна прагназаваць таму, што сваёй тэматыкай і кампазыцыйнай будовай "Баляда пра "Славянскі базар" ёсьць яскравым працягам клясычнага музычнага фэльетону Віктара Шалкевіча "Таварыш Сапега".

Вядома, як важна сучаснаму выканаўцу бардаўскай песьні ствараць яркія ды запамінальныя аранжыроўкі, вылучацца ў музычным пляне на фоне шматлікіх калегаў па цэху. Вось таму Шалкевіч увесь час шукае мэлядычныя разынкі для сваіх песень. Няхай гэта будуць рытмы танго ці правінцыйнай полькі, вядомыя кабарэтовыя ці гарадзкія фальклёрныя тэмы мінулых гадоў, стылізацыі пад рок-баляды ці пад блюзавыя стандарты. Рэалізаваць гэтыя мэлядычныя фантазіі выканаўцу дапамагаюць сябры-музыкі. У прыватнасьці, на канцэрце, які стаў асновай для канцэртнага альбома "Шчасьлівая сямёрка", адзначыліся пастаянныя ўдзельнікі канцэртных выступаў артыста і ягоных студыйных працаў – музыкі Анатоль Кандыба (фартэпіяна) і Аляксандар Габец (бас). Дзякуючы іхняму ўдзелу, у музычнай праграме канцэрту былі найбольш яскрава падкрэсьленыя ўсе выканаўчыя нюансы, якія характэрызуюць творчую манэру Віктара Шалкевіча, а сам канцэрт набыў рысы паўнацэннага музычнага спэктаклю. У гэтым бачыцца асноўная каштоўнасьць альбому "Шчасьлівая сямёрка".

Што тычыцца часткі праграмы дыску, які мае падзагаловак "Некаторыя старыя песьні ў новым жывым запісе", дык яны гучалі на некаторых папярэдніх кружэлках Шалкевіча. У прыватнасьці, на альбомах "Правінцыя", "Смутны беларускі блюз", "Баляды і рамансы", "Добрай раніцы", "За сто крокаў ад Вострае брамы, альбо геаграфія ВКЛ і ваколіцаў" і іншых. Таму гэтыя бонусы дыска – ня проста спроба запоўніць дыск, але і шанец для слухачоў параўнаць канцэртнае выкананьне вядомых гітоў зь іх студыйным увасабленьнем.

Як адзначыў ва ўступным да дыска артыкуле музычны крытык В. Мартыненка, дыск – "сымбалічная шчасьлівая сямёрка да кругленькага юбілею Віктара Шалкевіча, вялікага і магутнага, прышпільнага й непаўторнага, вясёлага і задуменнага". Упэўнены, гэтую выснову Вітаўта раздзеляць і слухачы, якія стануць слухачамі "Шчасьлівай сямёркі".

***Анатоль МЯЛЬГУЙ***
***http://mialguj.livejournal.com***

Bielarus569C.qxd 6/13/2010 12:47 AM Page 9



# “Шануйце-ж мову нашу, беларускую...”

*Заканчэньне з бачыны 2*

## Здрада як варыянт “дэмпалітыкі”

Уяўнае аслабленьне антыбеларускага рэжыму, і асабліва захоп прамаскоўскаю агентураю ўлады ва Ўкраіне, выклікала актывізацыю прарасейскіх асобаў у вікаўскай апазыцыі. Фактычная роля іх нікчэмная – дызарыентаваць беларускае грамадзтва (адвесьці ад нацыянальнага змаганьня) і стварыць фон для легітымізацыі выбараў рэжыму, плюс спажываньне чужых рэсурсаў.

Нядаўна прадстаўнік гэтай групоўкі Андрэй Саньнікаў выклаў пляны свайго “прэзыдэнцтва” летувіскаму парталу (DELFI.Lt). Там ён кажа шмат пра што, але толькі не пра антыбеларускую антынацыянальную палітыку рэжыму, не пра этнацыд, не пра вынішчэньне беларускае мовы, культуры, не пра забіваньне нацыі, не пра галоўныя праблемы выжываньня і існаваньня нашага народу. Гэта палітычна чужая для беларусаў публіка, пустыя іхнія разважаньні.

Цікава паглядзецьзрэз электарату, які падтрымлівае Саньнікава. Гэта пастаянныя сотня-паўтары чалавек. Амаль усе яны сабраныя на сайце Хартыі-97 і выказваюць поўную падтрымку свайму прэтэндэнту. Такой махровай прамаскоўшчыны невядома яшчэ дзе і пашукаць (хіба што ў таварыша Супэрфасфатава). Пэрлы іхняе дэмакратыі і падтрымкі Саньнікава проста просяцца ў цытаты. Напрыклад: “Раиса Захаровна: Родина моя, Белоруссия! Как же я тебя ненавижу!!! И все из-за одного единственного придурка”. Ці такое: “Luchs: Не купляйце беларускае!!! Покупая белорусские товары, вы работаете на руку режиму!”

Але нічога дзіўнага, рэжымная апазыцыя таксама антыбеларуская, як і рэжым, (розьніца невялікая). Рэжыму патрэбная такая апазыцыя для легітымізацыі яго аўтарытарнае ўлады (асабліва на выбарах). У гэтым квазі-апазыцыйным сэктары адбываюцца і чуюцца рэчы, абсалютна неверагодныя для нармальнай палітыкі і прынятых дачыненьняў. Тут усур’ёз абмяркоўваюць падтрымку Масквы для “апазыцыйнага” кандыдата на беларускіх выбарах, запабягаюць, імкнуцца яе (гэтую падтрымку) атрымаць, едуць у Маскву, просяцца і г. д. Абсурд і крымінал. (Дарэчы, з Захадам тое-ж самае.) Сумленьне гэтых людцаў ужо так абтрапалася, што яны даўно не адчуваюць ні нармальнасьці, ні рэальнасьці. Здрада Беларусі разглядаецца імі як варыянт “дэмакратычнай” палітыкі.

Паспрабуем уявіць, што-б было, калі-б у Эстоніі ці Польшчы апазыцыя абмяркоўвала пытаньне аб грошах і палітычнай падтрымцы Масквы (ці немцаў) для польскіх (эстонскіх) кандыдатаў на выбарах? Канец такой “апазыцыі” і судовы працэс стаўся-б імгненна. Там немагчымае існаваньне антынацыянальнае апазыцыі, бо там нармальная нацыянальная дзяржава і нацыянальная ўлада.

У Беларусі ўлада антынацыянальная, антыбеларуская. Адпаведна і апазыцыя, якую ўлада сфармавала пад сябе, ня ёсьць нацыянальнаю, ня ўлучаная у нацыянальную палітыку, асноўныя яе “лідэры” – выхадцы з сыстэмы рэжыму і зь ягоных ўстановаў. Як ствараласея гэтая “апазыцыя” пры дапамозе Ганса Віка, КГБ і брусэльскіх грошай, ужо добра вядома і апісана.

Нацыя мае пэрспэктыву змаганьня і разьвіцьця толькі тады, калі мае нацыянальную апазыцыю. У сярэдзіне 90-х беларускае грамадзтва ў гэтым сэнсе, ня гледзячы на антыбеларускі рэжым, мела магчымасьць нацыянальнае будучыні, дзякуючы нацыянальнай апазыцыйнай сіле і дамінацыі БНФ. Але і Захад, і Ўсход маглі толькі тады праводзіць у Беларусі сваю палітыку, калі не існавала гэтае нацыянальнае сілы. У выніку Захад і Ўсход (праз антыбеларускі рэжым) аб’ядналі сваю дзейнасьць па ліквідацыі Фронту.

Ім не ўдалося ліквідаваць кіраўніка Фронту і сам Фронт, але было зроблена істотнае – арганізацыю распалавінілі, і палітычная дамінацыя яе была страчаная. Узамен стварылі крэатуру – “дэмакратычную апазыцыю” без нацыянальнае ідэі.

## Перакуліць рэжым можна байкотам

Раскол Фронту і пераход часткі ягоных кіраўнікоў на пазыцыі “прагматызму” (варыянт “рэаль-палітык”) і касмапалітычнай дэмакратыі (а, фактычна, прарасейскай) стаўся ганебнаю дэманстрацыяю палітычнае слабасьці ў шэрагах нацыянальнага руху, адсутнасьцю імунітэту на магію грошай, на ўплывы чужой палітыкі.

На сёньняшні дзень (паўтаруся ізноў) пры дамінацыі рэжымнай дэмапазыцыі – нацыянальнай пэрспэктывы ў Беларусі няма.

Акрамя нацыянальна-адраджэнскае (кансэрватыўнае) часткі Фронту (КХП – БНФ) што-ж засталося здаровага ў нашым палітычным грамадзтве? Застаўся наш разумны народ, нашыя добрыя (няхай сабе і запалоханыя рэжымам) беларускія людзі. Шостым пачуцьцём яны адчулі фальш і небеларускасьць вікаўскай апазыцыі і ніколі не падтрымлівалі яе, бачачы, што яна выглядае яшчэ горш за рэжым. І як толькі ні абзываюць гэтыя абстрактныя дэмакраты нашых людзей за тое, што тыя не падтрымліваюць іхных “дэмакратычных” памкненьняў: і “электаратам”, і “чаркаю, і шкваркаю”, і “статкам”, і “халуямі”, і нават “быдлам”. Але людзі паводзяць сябе адэкватна, не падтрымліваюць прадажных. Ізноў-жа, шостым пачуцьцём яны адчулі, што калі такіх пусьціць ва ўладу, можа стаць яшчэ горай. Адчулі правільна. Хвала ім.

Для фронтаўцаў, для народнае партыі (КХП – БНФ) самае важнае тое, што наша пастаянная дзесяцігадовая праца па прапагандзе байкоту не мінула дарма. Пасіўны байкот ужо пачаўся. З 2008 году людзі перасталі хадзіць на выбары. Задача ператварыць гэты настрой людзей у актыўны байкот, працягам якога мусіць стаць патрабаваньне новых выбараў па закону – без удзелу Лукашэнкі. Гэты тэзіс трэба паставіць ужо цяпер.

Вось вам вынік, першая ўзнагарода за жмудную працу. Ад нас адабралі ўсё, загналі ў падпольле, але дзесяць гадоў сыстэмнае асьветніцкае і нуднае нябачнае палітычнае працы зь людзьмі далі эфэкт (адначасна мы стварылі Народны мэмарыял Курапаты). Маятнік зрушыўся. Байкот мабілізуе людзей і даканае рэжым. Рэжым шалёна баіцца байкоту, бо тады фальсіфікацыйная машына глохне. Немагчыма тайна сфальсіфікаваць пустату (калі людзі ня прыйдуць галасаваць). Прыдзецца хлусіць яўна. А гэта ўсім відаць. Тады рэжымная хлусьня робіцца чыньнікам пратэстнае кансалідацыі людзей, бо ўсе ўбачаць, што ўзурпатар ня мае падтрымкі і лжэ.

Маніпуляцыі з законам не дапамогуць. Ліквідацыя бар’еру колькасьці прагаласаваных ня выратуе. Наадварот аблегчыць байкот. “Усенародная прызнаньня” і “элегантнае перамогі” стварыць больш ня ўдасца. Для ўзурпатара застаецца грубая, усім бачная (і даказуемая) хлусьня альбо сілавы варыянт. Абодва варыянты дрэнныя для рэжыму і фатальныя асабіста для Лукашэнкі.

Галоўнаю задачаю ўзурпатара на выбарах будзе любым спосабам захаваць уладу. Лукашэнка дайшоў да таго, што пачаў нават публічна пагражаць народу расправаю, маўляў, “в случае чего” так дасьць, што “мало не покажется” (выступ у “палатцы”). Гэта вельмі безадказная заява, бо “в случае чего”, калі ён яшчэ праўле нашую кроў і каго-небудзь заб’е, то спакойныя беларусы (а я іх добра ведаю) павесяць яго за ногі, як Мусаліні, і яму ня тое, што здасца мала, а стане дастаткова (яму і ўсёй ягонай камарыльлі).

У заключэньне мушу зрабіць адну асьцярожную заўвагу. Пры варыянце масавага няўдзелу ў галасаваньні і масавых патрабаваньняў (калі ўзурпацыя пачне трашчэць), вельмі важна вылучыць тады беларускую альтэрнатыву. Калі такога не адбудзецца і альтэрнатыва будзе ніякай альбо чужой, тады перамены могуць стацца горшыя, чым рэальнасьць, і хутка прывядуць (могуць прывесьці) да страты эканамічнага (а потым і палітычнага) сувэрэнітэту дзяржавы (бо існуе агрэсіўны чыньнік гэбісцкай Расеі).

Нельга дапусьціць стварэньня сытуацыі яшчэ горшае, чым тая, што існуе. Адзін раз беларускае грамадзтва ўжо купілася на “абы перамены”. Успомнім прапаганду “абы ня Кебіч”. У выніку – атрымалі Лукашэнку. У пэўных умовах можа ўзьнікнуць выбар: часова пакінуць слабы беспэрспэктыўны рэжым і захаваць грамадзкі патэнцыял узьдыму супраць рэжыму, каб гарантавана вырашыць праблему ўлады іншым чынам і з другога заходу (бо рэжым ўжо будзе асуджаны). Гэта справа дакладная і, калі прыйдзецца, яе трэба будзе вырашаць па хадзе падзеяў.

Слабейшы варыянт. Калі байкот і сытуацыя будуць пасыўнамі (гэтага нельга выключаць), то застанецца аслаблены, нелегітымны ў сьведамасьці людзей, падвешаны рэжым. Гэта лепш чым “элегантная перамога” і выбары з масавым галасаваньнем.

Сілавыя варыянты зьмены ўлады мы не разглядаем. Але магчымасьць якой-небудзь непрадуманай авантуры ці правакацыі я не выключаю. Гэтыя варыянты шкодныя і небясьпечныя найперш ў тым сэнсе, што могуць прывесьці да ўмяшаньня чужога войска, што выкліча альбо акупацыю, альбо вайну. Нельга дапусьціць, каб народ плаціў неверагодна высокую цану за аднаго ўзурпатара.

Падкрэсьліваю тое, пра што кажу ўвесь час. На выбарах галасаваньнем перамагчы дыктатуру ў прынцыпе немагчыма. Улада, сродкі інфармацыі, падлік галасоў (фальсіфікацыйная машына) – усё ў руках дыктатара. Кантралюемая апазыцыя, якая ўдзельнічае ў выбарах, і масавае галасаваньне служаць пры дыктатуры для легітымізацыі рэжыму. Перамагчы можна байкотам (пазбавіўшы фальсіфікацыйную сыстэму фактуры для маніпуляцыі). Але гэта ёсьць ужо не імітацыя палітыкі, а сапраўдная народная палітычная барацьба. І кожны мусіць памятаць, што ўзурпатар ня мае ніякага юрыдычнага права ўдзельнічаць у выбарах, балатавацца чацьверты раз.

**Б**

# Ліст у рэдакцыю

## Беларуска-Амэрыканскае Разадзіночаньне

Ня ведаю, як каму, але мне, сяброўцы БАЗА, прысутнай амаль на кожным сходзе, ужо надакучыла тое, што наш чарговы сход ператвараецца ў пляцоўку для высьвятленьня асабістых адносінаў. Пры гэтым усе прысутныя апынаюцца ў ролі міжвольных сьведкаў.

Я добра разумею, што зараз у БАЗА цяжкі час. Але нават пры ўсім гэтым сутыкненьні інтарэсаў трэба шукаць іншыя, акрамя адкрытага канфлікту, шляхі вырашэньня праблемы. Больш таго, пакуль ў арганізацыі ня будзе ўнутранага парадку, зьнешнія праблемы ня зьнікнуць.

Апошні сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА 15 траўня 2010 г. яскрава выявіў, што гэтым простым ісьцінам кіраўніцтва аддзелу не надае належнае увагі. Тут усё яшчэ не навучыліся паважаць адзін аднаго і ня ведаюць, што на падобных сходах, у прысутнасьці вялікай колькасьці людзей, прынята зьвяртацца адзін да аднаго на Вы ў не залежнасьці ад таго, якія паміж вамі складзіся асабістыя адносіны. Нават калі вы ня згодныя з апанэнтам, трэба яго выслухаць. Пра гэтае даўно пазабывалі ў БАЗА, дзе кожны чамусьці лічыць, што тое, што ён зьбіраецца сказаць, важнейшае за выказваньне суразмоўцы.

Такім чынам, нават сп. Станкевіч, які ў нечым ня меў рацыі, захоўваючы спакой і не апускаючыся да ўзроўню выказваньня ўзаемных прэтэнзіяў, выглядаў больш годна, чым тыя, хто ўвесь час яго перабівалі і спрабавалі перакрычаць. Калі сп. Станкевіча пусьцілі на сход, чаму-ж ня даць яму слова? Выглядае на тое, што кіраўніцтва не паважае ня толькі яго, але і нас, прысутных сябраў БАЗА. Ці нас лічаць настолькі несьвядомымі і мяркуюць, што, выслухаўшы абодва бакі, мы ня зможам самастойна зрабіць свой выбар?

Чаму было ня даць сп. Станкевічу выказацца, калі ён хацеў зьвярнуць увагу на нейкія недахопы? Ведома, што фармальна пры адсутнасьці кворуму, выбары кіраўніцтва аддзелу ня могуць быць праведзены. Дык чаму-ж не зьвярнуць на гэта асаблівую ўвагу? Праблемы з адпаведным месцам для правядзеньня сходаў ня ёсьць адзіным чыньнікам адсутнасьці вялікай колькасьці сяброў пры выбарах кіраўніцтва. Тое, што мы ніяк ня можам сабрацца разам, – яшчэ адно сьведчаньне нашай разьед... нанасьці. Хочацца спадзявацца, што каб спадару Станкевічу не было больш нагоды зрываць сходы аддзелу, яго абранае кіраўніцтва ўсе-ж выканае свае абавязкі і давядзе да ладу сьпіс і дакументы арганізацыі.

Беларуска-Амэрыканскае Зазадзіночаньне сапраўды патрэбна нам, беларусам. Давайце перастанем руйнаваць яго знутры і зробім усё магчымае, каб яго захаваць. Прыслухаемся да спадара Антона Шукелойца, які некалькі разоў падчас сходу заклікаў усіх шанаваць арганізацыю і адзін аднаго, але, на жаль, так і застаўся непачутым...

**Г. АСТАШОНАК**

Bielarus569C.qxd 6/13/2010 12:47 AM Page 2



**У ліпені спаўняецца 95 гадоў слаўнаму дзеячу беларускай грамады ў Амэрыцы, сябру нацыянальнага вызвольнага руху ў Заходняй Беларусі, сябру Беларускай Незалежніцкай Партыі, аднаму з засноўнікаў БАЗА і шэрагу іншых беларускіх арганізацыяў у ЗША, шматгадоваму старшыню Галоўнай управы БАЗА сп. Антону ШУКЕЛОЙЦЮ.**

**Жадаем юбіляру здароўя, аптымізму і доўгіх гадоў жыцьця – каб ён дачакаўся ўбачыць сапраўды вольную і незалежную, сапраўды беларускую Бацькаўшчыну.**

**Выказваем удзячнасьць за адданасьць беларускай справе, за шчырую дапамогу моладзі ў справе пачатку новага жыцьця ў Амэрыцы, у падтрымцы беларускага духу, беларускай мовы і культуры далёка ад Бацькаўшчыны.**

**Спадзяемся, сп. Шукелойць, што Вы яшчэ доўга і плённа будзеце весьці далей сваю грамадзкую і асьветніцкую дзейнасьць на радасьць нам усім і на карысьць Беларусі.**

***Управа Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА***

***Рэдакцыя "Беларуса" далучаецца да віншаваньня і пажаданьняў нашаму шаноўнаму вэтэрану.***

***Ніжэй зьмяшчаем раней недрукаваны верш Натальлі Арсеньневай, які яна некалі даслала сп. Шукелойцю на імяніны, якія ён мае ў чэрвені.***

сп. Шукелойцю
з павіншаваньнем, праўда, спозьненым, зь Днём Ягонага Св. Патрона
св Антона.

**Малітва**
**да цудатворнага абразу Жыровіцкай Божай Маці**

О, Маці, што закрасавала
Свайму народу не ў цьвярдыні,
Акрытай славаю нязьвялай,
А на ігрушцы ў пушчы сіняй.

Ты, што ўспыхнула зарніцай
Не ўладаром зямных узвышшаў,
А пастушком малым і ніцым,
Будзь нашай Радасьцяй Нясьцішнай.

Будзь апякункай усеможнай
І тым, што гінуць за радзіму,
І тым, што торбы падарожнай
Важкое з плеч ніяк ня здымуць.

Дай, каб нам гарт ва ўсім дастоіў,
Дай, каб мы верылі, як дзеці,
Дай, каб Імя Тваё Сьвятое
Пранесьлі зь вераю па сьвеце.

Дай, каб злаба, мана, зацятасьць
Нам не былі ў жыцьці спакусай...
Вярні нам нівы нашы й хаты,
О, Маці божай Беларусі!

*У нядзелю, **18 ліпеня 2010 году,** традыцыйным Маршам пачынаецца*

# Тыдзень Паняволеных Народаў,

*які быў зацьверджаны Кангрэсам ЗША праз Грамадскі закон 86-90 яшчэ ў 1959 годзе, як выказ пратэсту народаў сьвету супраць камуністычнай і таталітарнай тыраніі ў сьвеце. У імпрэзах Тыдня і ў Маршы Паняволеных Народаў традыцыйна бярэ ўдзел беларуская грамада Нью-Ёрку і Амэрыкі.*

***9:00*** – ***збор удзельнікаў Маршу*** *на Пятай авэню на 59-й вуліцы (ля фантану гатэлю Пляза).*
***10:00*** – ***імша за Паняволеныя Народы*** *ў Катэдры сьв. Патрыка на 5-й авэню і 50-й вул.*
***11:00*** – ***Марш Паняволеных Народаў*** *па Пятай Авэню да 72-й вул.*
***12:00*** – ***афіцыйнае адкрыцьцё*** *Тыдню Паняволеных Народаў (Цэнтр. парк).*

*Пасьля Маршу, а 2-й гадз. Папаўдні ў Цэнтральным парку ля помніка Ягайлу (79 вул., каля Чарапашай сажалкі –Turtle Pond) адбудзецца ліпеньскі сход Нью-Ёрскага аддзелу БАЗА.*

## Ганаровае таварыства

7 травеня сёлета ў будынку Капітоля штату Нью-Джэрзі ў горадзе Трэнтане адбылася ўрачыстая цырымонія прыняцьця лепшых студэнтаў з блізу 30-х унівэрсытэтаў штату Нью-Джэрзі ў Ганаровае Эканамічна-Бізнэсовае Таварыства. Каб быць прынятым у Таварыства, трэба быць рэкамэндаваным прафэсарам унівэрсытэту, а паводле экзамэнацыйных адзнакаў быць у рэгіёне 99,99 з 100 мажлівых!

Сябрам Таварыства стаўся таксама беларус **Аляксандар БЯРЫЛА** – студэнт эканамічнага факультэту Ратгерскага Штатнага Ўнівэрсытэту – былы маладафронтавец, змагар за дэмакратыю ў радзімай Гародні.

Саша! Віталі мы цябе ў той дзень ды вітаем і праз "Беларуса".

***Сябры***

# Паведамленьне

## Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва

Ад даты свайго заснаваньня ў 1951 г. за гады свае дзейнасьці БІНіМ выдаў па-над пяць дзясяткаў кнігаў, такія, як "Архівы БНР", "Ангельска-беларускі слоўнік", выбраныя творы Н. Арсеньневай ды шэраг іншых пісьменьнікаў дыяспары – працаў, важных для беларускае нацыянальнае культуры ды гісторыі. Таксама ад пачатку выдае рэгулярна "Запісы" (у дарозе 33 выпуск).

Даўно адыйшлі ў лепшы сьвет заснавальнікі БІНіМу ды каля сотні актыўных сябраў паваенае хвалі эміграцыі ў ЗША. Творчую дзейнасьць БІНіМу сягоньня амаль цалкам пераняла маладыя навукоўцы як новых хваляў эміграцыі, гэтак і на Бацькаўшчыне. Гэтаксама трэба падкрэсьліць, што фінансавую дзейнасьць Інстытуту ад самага пачатку забясьпечвала беларуская дыяспара, а ад 1960-х гадоў значную дапамогу аказвала БІНіМу Фундацыя імя П. Крэчэўскага. Гэтыя два дабрадзеі, гаворачы вобразна, застаюцца галоўнымі эканамічнымі забясьпячэнцамі Інстытуту ў ЗША і на сёньняшні дзень. А, дарэчы, на выдавецкім варштаце БІНіМу знаходзіцца шэраг вялікіх працаў, як, прыкладам, "Гісторыя БАЗА", другое, пашыранае выданьне твораў У. Дудзіцкага, даведнік беларускіх архіваў, друку эміграцыі і г. д.

Гэтае паведамленьне – зварот падтрымаць Выдавецкі Фонд Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва.

На сёньняшні дзень на Выдавецкі Фонд БІНіМу ахвяравалі:

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Др. Я. і Н. Запруднікі** | **$1000** | **Н. і М. Глушак** | **$50** |
| **К. і Я. Вініцкія** | **$300** | **Т. Кольба** | **$50** |
| **Др. М. Дэмковіч** | **$200** | **С. Шабовіч** | **$50** |
| **Б. Паўк** | **$200** | **Л. Шурак** | **$50** |
| **Др. А. Занковіч** | **$100** | **Л. Дубовік** | **$50** |
| **Др. У. і С. Ванцэвічы** | **$100** | **Ж. Малашэвіч** | **$30** |
| **У. і Л. Ракуці** | **$100** | **Л. Кавалёў** | **$25** |
| **Н. Кіт** | **$100** | **Л. Маркоўская** | **$20** |
| **А. Кажан** | **$100** | | |

**Усім шчыры дзякуй!**

Ахвяраваньні слаць на адрас:

**BINIM**
**330 Park Steet**
**Haworth, NJ 07641**

***Газэта "БЕЛАРУС" бясплатна надрукуе кароткія прыватныя паведамленьні й аб'явы некамэрцыйнага характару, віншаваньні, запрашэньні, спачуваньні ды інш.***

***Накант разьмяшчэньня рэкламы кантактуйце рэдакцыю.***

***Просім чытачоў дасылаць для друку ў газэце свае зацемкі аб падзеях беларускага грамадзкага жыцьця ў іхных суполках, а таксама лісты са сваімі думкамі й меркаваньнямі***

### *НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД "БЕЛАРУСА" АХВЯРАВАЛІ:*

**Я. Завістовіч** ............. **100**
**Б. Паук** .................... **100**
**Ю. Андрусышын** ......... **50**
**В. Крупнік** ................ **50**

**Усім шчыры дзякуй!**

### Удакладненьне

У травеньскім нумары "Беларуса" было памылкова надрукавана, што Я. і К. Вініцкія ахвяравалі на выдавецкі фонд "Беларуса" $50 замест кветак на магілу Джона Кульбяды. На самой справе гэтае ахвяраваньне даслала нам **Марыя ДЭМКОВІЧ**. Прыносім свае прабачэньні за недагляд.

**БЕЛАРУС**
*Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце*
**Выдае штомесячна:**
***Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне***
**Сусьветнае сеціва:** ***baza-belarus.org***
**Падпіска $50 на год.**
**Чэкі выпісвайце на *BIELARUS***

**BIELARUS**
*Belarusan Newspaper in the Free World*
Published monthly by
***Belarusan American Ass'n, Inc.***
Subscription $50 yearly
Make checks payable to ***BIELARUS***

**Рэдагуе калегія.**
**Адказны рэдактар Марат КЛАКОЦКІ**
**Падпіска Сяргей ТРЫГУБОВІЧ**

**Артыкулы, падпісаныя прозьвішчам ці ініцыяламі, могуць зьмяшчаць погляды, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.**

**Передрук дазваляецца толькі пры ўмове зазначэньня крыніцы.**

© BIELARUS, 2010

**Адрас для допісаў і кантактаў:**

***BIELARUS***
***P.O. Box 3225***
***Farmingdale, NY 11735***

E-mail:
***hazetabielarus@att.net***

**Сусьветнае сеціва:**
***www.bielarus.org***

ISSN 1054-9455

**Адказнасьць за зьмест рэклямы нясе рэклямадаўца.**